**Да 70-годдзя вызвалення Беларусі**

Я была ў Брэсцкай крэпасці. Я глядзела экспанаты, здымкі музея. Жудасна стала на душы. Якое гора, страх адчувалі людзі ў час вайны. Страшна ад думкі, што вайна можа пачацца зноў.
Як добра жыць на свеце без вайны!

**Як добра жыць на свеце без вайны!**

Як хораша прачнуцца на світанні,
І ведаць, што вайны даўно няма.
Як хораша паслаць зямлі вітанне
І з выраю сустрэць прылёт бусла!

Як добра раніцой сустрэцца з сонцам,
А ноч спакойна спаць і мроіць сны!
Як добра бачыць неба праз аконца!
Як добра жыць на свеце без вайны!

Па гэты дзень ў народзе жыве памяць,
Пра шчасце пераможнай той вясны.
На скронях сее срэбра гадоў замець…
Як добра жыць на свеце без вайны!

Вайна прайшла,а боль жыве ў народзе…
Ён кроіць сэрца і халодзіць кроў…
Жывём мы ў мірнай, добрай, дружнай згодзе…
-Як добра, што вайны няма!!- кажу я зноў!

Жыві,мой край! Красуйся год ад году!
Квітней, Айчына-маці, кожны дзень!
Жадаю сонечнага шчасця я народу…
Хай не кране ніколі вайны цень!

*Скібіцкая Наталля, вучаніца 8 класа*

